# Неспакойны характар

**НА КОНКУРС**

Побач з шахтамі рудніка ўзвышаецца вялікі пяціпавярховы будынак. Ні днём, ні ноччу не змаўкае тут шум магутных і складаных машын і механізмаў. Гэта доследна-абагачальная фабрыка Салігорскага калійнага камбіната.

У знамянальны дзень 17 кастрычніка 1961 года, за паўтары гадзіны да пачатку работы гістарычнага XXII з'езда КПСС, адбылося ўрачыстае адкрыццё гэтага прадпрыемства. Радасцю свяціліся твары ўсіх тых, хто ўзводзіў гэта велічнае збудаванне. І радасць была зразумелай: многім упершыню прыйшлося прымаць удзел у такім будаўніцтве. Не было належнага вопыту, прыходзілася пераадольваць і рад іншых цяжкасцей. І ўсё ж слова сваё будаўнікі, мантажнікі, інжынерна-тэхнічныя работнікі стрымалі: у тэрмін, вызначаны ў сацыялістычных абавязацельствах, фабрыка ўступіла ў строй.

І радаваўся, і хваляваўся ў гэту раніцу і Міхаіл Іванавіч Панамароў — брыгадзір слесараў-мантажнікаў.

Міхаіл Іванавіч многае зрабіў у тыя напружаныя дні, калі ў разгары быў мантаж абсталявання на абагачальнай фабрыцы. Людзі працавалі, не лічачыся з часам. Складаная была работа. Трэба было ўстанавіць апараты па зрабненню пароды, фільтровачныя цэнтрыфугі, флатацыйныя машыны і іншае складанае абсталяванне. Вось тут вельмі спатрэбіўся багаты вопыт Міхаіла Іванавіча Панамарова.

Радавым рабочым прыйшоў у 1931 годзе Міхаіл Іванавіч на Салікамскі калійны камбінат. Тут і набыў спецыяльнасць слесара. Працаваў слесарам, затым механікам аддзялення абагачальнай фабрыкі. За шматгадовую і бездакорную працу ўзнагароджан трыма медалямі, мае звыш дзесятка ганаровых грамат.

У Салігорск Міхаіл Іванавіч прыехаў у маі мінулага года. За паспяхова праведзены мантаж абсталявання на доследна-абагачальнай фабрыцы тав. Панамароў узнагароджан ганаровай граматай, занесен у Кнігу гонару. Партрэтную галерэю перадавікоў вытворчасці будоўлі ўпрыгожвае і яго партрэт.

Калі доследна-абагачальная фабрыка ўступіла ў строй дзеючых, Міхаіла Іванавіча прызначылі старшым слесарам па рамонту абсталявання. Дзякуючы стаwedług Міхаіла Іванавіча і яго таварышаў па рабоце складаныя машыны працуюць справўна. А гэта дазваляе паспяхова выконваць план навукова-даследчых работ.

Вялікая і адказная задача пастаўлена перад калектывам доследна-абагачальнай фабрыкі: у верасні гэтага года трэба даць праектнаму інстытуту ўдакладненыя даныя па флатацыйнаму абагачэнню калійных солей для праектавання прамысловай абагачальнай фабрыкі. З гэтым заданнем калектыў спраўляецца паспяхова. Ёсць тут і значная заслуга старшага слесара Міхаіла Іванавіча Панамарова.

...Вадкая маса з крышталямі з пульпы паступае ў бакі для перамешвання. Але адлегласць паміж днішчам бака і мяшалкай аказалася вялікай. У выніку крышталі асаджваліся на днішча і не перамешваліся. Слесары пад кіраўніцтвам Панамарова выправілі становішча. Мяшалкі былі «пасаджаны» ніжэй, і працэс перамешвання стаў праходзіць нармальна.

...Для падагрэву шчолаку ў працэс дабаўлялі гарачую ваду. Яна разбаўляла шчолак, і ўдзельная вага атрымлівалася не тая, якая патрабавалася. А гэта значыць, што нельга было нармальна весці працэс. І тут дапамаглі дапытлівы розум і рабочая кемлівасць вопытнага слесара. Да бака Ф-52 быў зроблен падагравальнік.

...Было ўстаноўлена, што ў выніку вялікіх абаротаў атрымліваецца заглушэнне пены ў камерах. І зноў за справу ўзяліся слесары, якімі кіруе тав. Панамароў. Яны правялі рэвізію флатацыйных машын з рэгуліроўкай заглушак і заменай шківаў на электраматорах са змяншэннем абаротаў.

...І зноў новае заданне. Трэба установіць барабан фільтра для фільтрацыі канцэнтрату. Дадзен тэрмін для выканання гэтай работы. Але Міхаіла Іванавіча зноў нешта хвалюе.

— А можа раней зможам устанавіць барабан? — звяртаецца ён да сваіх таварышаў.

Сказалі сваё слова слесар Адам Абраменя, электразваршчык Аляксандр Кузняцоў і іншыя. Задаволен Міхаіл Іванавіч. Значыць, яго клопаты— іх клопаты.

— На тыдзень раней тэрміну выканаем заданне! — з задавальненнем падагульніў размову старшы слесар.

І слова было стрымана.

Калі ёсць свабодная мінута, Міхаіл Іванавіч ідзе паглядзець, што робіцца на будаўніцтве прамысловай абагачальнай фабрыкі. Свае веды і багаты вопыт ён марыць прымяніць і тут, калі пачнецца мантаж абсталявання.

**А. ДУБІЦКІ,**
**наш няштатны карэспандэнт.**

Рэдактар Б. М. ПЕРНІКАЎ.